**Бірукоў, В.** У памяці родных і блізкіх жыве / В. Бірукоў // Наша Талачыншчына. – 2006. – 27 ліп. – С. 1.

## У ПАМЯЦІ РОДНЫХ І БЛІЗКІХ ЖЫВЕ




Аднойчы сустрэўшыся на могілках у вёсцы Курчэўская Усвейка з маці загінуўшага воіна-афганца, усе гэтыя амаль 20 год бачыліся мне вочы матулі. Вось яна на лаўцы каля дом, куды мы пад’ехалі з прадстаўнікамі райкама партыі і камсамола, сельскага Савета, а потым, ёй як бы ўсё роўна было, дабіраліся па палявой дарозе на ўзгорак, дзе сярод іншых і магілка яе сына. Бялюткія на фоне блакітнага зімняга неба бярозкі, чырвоныя гваздзікі, што ляглі на снег, і ўся ў чорным, зусім ніякая, яна. Прытулілася да халоднага камення і, здаецца, нічога не бачыла. Не магла яна ў той час глядзець на ўвесь гэты белы свет, калі ў такую рань жыцця не стала яе дарагога, любімага сыночка…

І вось зноў еду ў гэтую вёску, да хаты, дзе ў адзіноце на лаўцы заспелі тады Лідзію Цітаўну. Прайшло шмат часу, думалася, не пазнаю і вёску, і знаёмую хату, і яе гаспадыню. Уяўлялася, што, магчыма, і не захоча Л. Ц. Шастакова пайсці на цяжкую размову, бо трэба ж, узгадваючы ўсё з маленства і да апошняй хвіліны ў жыцці Валодзькі, перажыць не адно шчымлівае да болю і адчаю пачуццё.

Усё ў гэты ліпеньскі, шчодры на цяпло дзень аказалася іншым.

Ля адзінага дома толькі  і заспелі мы групку жанчын. Падышла паштальён, абменьваліся вяскоўцы сваімі навінамі, распытвалі, чым жыве раён, спыталі, што прывяло “прэсу” ў іх глухамань. Пры знаёмстве называліся прозвішчы і імёны. Яна, што стаяла апошняй у крузе, схамянулася і сказала вельмі проста і сціпла: «А я сястра вось той Цітаўны, першай, а праз дарогу жыве яшчэ адна наша сястра… Вось мая хата».

Здзівілі парадак, дагледжанасць двара і каля яго. У хаце – чысціня, утульнасць. Значыць, усё ж, яна здолела вярнуць сабе сэнс жыцця. Шмат не трэба было, каб пакаціцца па нахільнай уніз, а прычыны – яны ж ёсць, усе зразумелі б, у большасці сваёй ніхто б і не стаў судзіць. Для прыліку памянташылі б языком – і кропка.

– Што крывіць душой, – гаворыць Лідзія Цітаўна, – спрабавала і я ад гора чаркай уратавацца. Не дапамагло. Толькі горш яшчэ было. Зразумела сама: так нельга рабіць – ганьбіць яго імя, добрую памяць аб ім. На Валодзьку нашага ў вёсцы не маглі нарадавацца. Заўсёды бачылі яго з пяшчотнай усмешкай, нікому слова дрэннага не сказаў. Ладзіў з усімі, усім дапамагаў, бескарысліва. А як любіў танцаваць, як спяваў свайго любімага «Орленка!». Прыйдзе з танцаў, а пад раніцу сама сон. Я ж нагледзецца на яго не магла, нагаварыцца з ім. Падыду да ложка, моўчкі на яго гляджу, блінцы ж цёплыя чакаюць, а ён позірк мой адчувае, просіць даць яму паспаць, у арміі ж не выспішся...

Ен хацеў стаць сапраўдным мужчынам. Марыў пра сур'ёзную службу, рыхтаваўся да гэтага з усёй адказнасцю. Неяк дома ў клубе завяліся старэйшыя, усчалася бойка, пад руку нядаўна прыйшоўшага з турмы трапіў і ён, малец. Маці заспела яго, калі ўсе разбегліся падалей ад бяды. Нічога не сказаў, толькі ўсхліпваў. Заканваючы васьмігодку, прызнаўся, што хоча стаць дэсантнікам.

Мара яго збылася. Вучыўся ў Магілёўскім вучылішчы металістаў, запісаўся ў клуб парашутыстаў. Тры скачкі з парашутам былі ўнесены ў яго асабістую кніжку. Займаўся спортам і барацьбой, калі прыйшоў рабіць токарам на мінскі завод «Ударнік».

Прызываўся на службу ў Мінску. Высокі, стройны, Валодзя звярнуў на сябе ўвагу, трапіў служыць у паветрана-дэсантныя войскі.

24 красавіка 1983 года ўся вёска праводзіла Валодзю Шастакова на службу. З Мінска, з завода, далі аўтобус, прыехала шмат сяброў, сабраліся ўсе родныя і блізкія. Уладзімір ужо ведаў, што пасля вучэбкі яго чакае Афганістан, папярэдняя размова пра яго будучыню адбылася ў Першамайскім ваенкамаце г. Мінска. Але дома, падчас праводзінаў, пра гэта не было ні слова.

За Валодзькам, прыгожым і добрым, дужым і смелым, заўсёды цягнуліся хлопцы. Не было адбою і ад дзяўчат. Як не ганарыцца такім сынам, які заўсёды мог і ўмеў падтрымаць бацькоў, брата, сяброў. І ў гэты дзень, дзень праводзінаў, ён шмат жартаваў. Ды толькі на сэрца маці кладліся ў віхуры вяселля самота, заклапочанасць, цяжар. Асабліва не знаходзіла месца сабе ў той момант, як аўтобус забуксаваў у лагчынцы, што цягнулася ад вёскі пад могілкі. Прыйшлося бацьку, Віктару Захаравічу, браць свой «Беларус» і выцягваць аўтобус. Кінутыя кімсьці словы аб дрэннай прыкмеце залеглі глыбока ў памяці.

Вучэбку Валодзя праходзіў у Фергане. Там і сфатаграфаваўся. Гэты адзіны армейскі здымак стаў сямейнай рэліквіяй. Партрэт з яго – Валодзька ў форме дэсантніка – захоўваюць маці і брат, перанесены ён і на помнік на могілках.

Дзевяць месяцаў прабыў Уладзімір Шастакоў у Афганістане. Пісьмы пісаў часта, супакойваў, што ўсё ў яго добра, няма за што яго родным хвалявацца. Такія ж лісты атрымлівалі і дзяўчаты, якія з ім перапісваліся. У апошнім пісьме напісаў, што хутка будзе год, к служыць, а там – і дадому.

А яна, маці, кожную ноч плакала. Падушка не паспявала высыхнуць. Употайкі хаваў слёзы і бацька.

Бой, у якім загінуў Уладзімір Шастакоў, быў для яго не першым. Сталася тое, пра што ён ніколі не пісаў, і што так востра прадчувала матуля. Бездапаможнай аказалася бронекамізэлька перад душманскай куляй. Яна трапіла прама ў сэрца наводчыка гарматы. За ім, умелым і бясстрашным, ворагі сачылі не адзін месяц.

Вобраз духоўны Валодзі суправаджае кожнага, хто яго ведаў, з кім ён вучыўся ў пачатковай школе ў Равяцічах, а потым у Серкавіцах. Дзякуючы гэтай духоўнасці, светлай яго душы, блізка адзін аднаго трымаюцца зараз матуля і сын, нявестка, іх дзеці. Лідзія Цітаўна трэці год без мужа, гаспадара, перанесла дзве цяжкія аперацыі. Але не скарылася перад лёсам. Часта прыязджае сын Сяргей, радуе сваёй працай, павагай і любоўю да матулі, да роднага свайго кутгочка. Унучка Ірына закончыла каледж, стала мастаком-дызайнерам, атрымлівала прэзідэнцкую стыпендыю, паступіла у інстытут. Усё добра складваецца і ў жыцці старэйшага ўнука.

Хутка Лідзіі Цітаўне 70 год, а яна трымае ўсю жыўнасць. З радасцю, расказвае, падзяліла ўнукам пенсію, а на пражыццё хопіць грошай, якія выручыць за прададзенае малако.

– Бог дождж даў – дык засыплюся збожжам, – з гонарам дадае Л. Ц. Шастакова. – Сілы самі не прыйдуць, яны даюцца чалавеку разам з працай, добрымі ўчынкамі, з верай у сябе самога. Я паверыла – вось і жыву…

Добрую, светлую памяць аб сыне Лідзія Цітаўна прадаўжае такімі ж справамі, і робіць гэта сціпла, прыстойна, не ставіць нікому ў віну тое, што яе сын загінуў.

У яе памяці ён па-ранейшаму жывы. Вось яго веласіпед, на якім ён катаўся ў тыя памятныя красавіцкія дні перад адходам на службу, яго кніжкі, кашуля…

Ён вярнуўся на радзіму, вярнуўся тым сціплым і стрыманым хлопцам, якім быў у юнацтве, і адначасова – вярнуўся героем.

**В. Бірукоў**